View metadata, citation and similar papers at core.ac.uk
brought to you by CORE
provided by Belarusian State Pedagogical University Repository

# ПАТЕМНАЕ І ЗАГАДКАВАЕ МАСТАЦТВА СЕЛЬСКАЙ МАЙСТРЫХІ

Кулінковіч Алена Вячаславаўна, ФЭА БДПУ
Кулапіна Святлана Станіславаўна, выкладчык

Спрадвеку, і не толькі на Беларусі, людзі марылі пра лепшае жыццё. Гэтую мару творцы з народа ўвасаблялі ў сваіх працах, суадносячы з надзеямі на райскае жыццё, уяўленне аб якім найчасцей падавалася мастакамі як казачныя сны з райскім садам, напоўненным белымі лебядзямі, зусім не злсцівымі ільвамі, дзе растуць пальмы, на якіх спяваюць казачныя птушкі.

Такія роздумы и пацуцці ўзнікаюць, калі мы бачым работы славутай беларускай мастачкі — Алены Кіш.

Нарадзілася яна ў мястэчку Раманава Слуцкага павета (цяпер вёска Леніна Слуцкага р-на) у сялянскай сям'і. Сям'я Кішаў была мнагадзетная. Андрэй Кіш, бацька будучай мастачкі, быў чалавек масцеравіты, за што не браўся — усё мог зрабіць сваімі рукамі. Напэўна, яго здольнасці перадаліся і Алене. Вучыцца ёй не было часу: дапамагала бацькам па гаспадарцы, гадавала разам з імі малодшых дзяцей, аднак не пакідала і маляванне, якое з гадамі перарасло ў жыццёвае прызначэнне.

Працы Алены Кіш падабаліся простым людзям, але прыходзілася зносіць і насмешкі, і кпіны вясковых людзей, якія лічылі вандроўную мастачку, у лепшым выпадку, дзівакаватай. У яе ніколі не было ні свайго дома, ні мужа, ні дзяцей. Хіба пойдзе, на думку вяскоўцаў, нармальны чалавек так вось цягацца па чужых вёсках, па незнаёмых людзях з вясны да восені? Пасля савецка-польскай вайны і ўсталявання новых межаў у 1921 г., Случчына адыйшла да савецкай Беларусі. Час быў вельмі цяжкі: голад, калектывізацыя, змаганне з "непрацоўнымі элементамі". Дзесьці ў пачатку трыццатых гадоў, каб падкарміць сям'ю, Алена рушыла з мастакоўскім начыннем у першую вандроўку па навакольных вёсках.

Алена заўседы малявала свае дываны толькі на тры цемы: “Рай”, “Дзева на водах”, “Пісьмо да каханага”. Цікава, што Алена Кіш ніколі не стварала дублікаты сваіх твораў. Так, па ўспамінах знаёмцаў мастачкі, калі яе прасілі паўтарыць яшчэ раз той ці іншы дыван, яна адказвала: "Не, лепш я за ноч надумаюся і намалюю такі, якога ні ў кога няма". Дываны Алены Кіш траплялiся як на Случчыне, так і за межамі Слуцкага раёна. У часы нямецкай акупацыі Алена Кіш таксама спрабавала зарабляць на жыццё сваім рамяством, але гэта не заўседы атрымлівалася. Пасля вайны людзі пакрысе вярталіся да жыцця, набывалі новыя рэчы, Алена Кіш па-ранейшаму малявала свае дываны, але куплялі іх усё менш… Цудоўныя дываны-

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

маляванкі ішлі на бытавыя патрэбы, хтосці рабіў з іх мяшкі для зерня, хтосьці кідаў  у гумно на падлогу. З’явілася новая мода. Дываны Алены Кіш перасталі прадавацца.

У 1949 годзе чуйная, трапяткая душа мастачкі, надламаная бясконцымі нягодамі, урэшце не вытрывала: жанчына утапілася ў маленькай рацэ.

Дываны Алены Кіш пры ўсёй іх непаўторнасці і ярка выяўленай індывідуальнасці па характары блізкія да традыцый народнага мастацкага роспісу, якія майстрыха, безумоўна, ведала і разумела. Дываны Алены ўяўляюць сабой унікальную з’яву не толькі ў галіне народнага роспісу, але і ў народным мастацтве Беларусі ў цэлым.

У маляваных дыванах Алены Кіш элементы арнаментальнага дэкаратывізму спалучаюцца з чыста станковымі распрацоўкамі канкрэтных сюжэтаў з дзейнымі асобамі. Але галоўным зяўляецца тое, што яе творы, як і ўсіх наіўных мастакоў, акрамя мастацкіх якасцей, мелі яшчэ глыбока насычаны духоўны змест. [1 с.7]

У творах Алены Кіш мы не знойдзем добрай мастацкай перспектывы, прапарцыянальнасці ў выяўленні вобразаў першага і другога планаў. Але менавіта гэтыя "тэхнічныя недакладнасці" і надаюць маляванаму дывану яго сапраўдную мастацкую каштоўнасць, даносячы да гледача не толькі эстэтычную, але і філасофскую глыбіню твора, якую адчувала мастачка і сваімі вобразамі перадала нам запаветныя роздумы аб жыцці. [1 с. 8]

Дыван «Дзева на водах» — рэдкі ўзор выяўленчасці і дэкаратыўнасці. Хоць твор мае досыць разгорнуты сюжэт (дзень і ноч), у манеры выканання яго бачыцца імкненне да дэкаратыўнасці, характэрнай для традыцыйных народных роспісаў. Лілеі на вадзе, лебядзі, мяцёлкі чароту размешчаны рытмічна і ў пэўным парадку, як на тканых вырабах. Дыван акаймаваны шырокай арнаментальнай паласой з парасткаў, бутонаў і кветак. Выкарыстаны чыстыя, сакавітыя, яркія фарбы без паўтонаў і колеравых пераходаў: сіняя, белая, аранжавая, зялёная.

У дыване «Рай» фантазія майстрыхі спалучыла ў кампазіцыі рэальны свет і ўяўленні пра тое прыгожае жыццё, якое, на яе думку, павінна быць адлюстравана на падобных творах. Сучаснага гледача здзіўляюць непрапарцыянальныя памеры жывёл і людзей на першым і другім планах. Своеасаблівую выразнасць і дэкаратыўнасць кампазіцыі надае ўпэўненая чорная лінія, якой абведзены абрысы малюнка, прапрацаваны кроны дрэў, кара, трава, грывы ільвоў, пер’е птушак. Рабоце майстрыхі ўласцівы колернасць, гучнасць фарбаў, арнаментальнасць вырашэння, аднак ім у большай ступені ўласцівы самадзейны пачатак, яна хутчэй нагадвае дзіцячы малюнак. [2 с. 233]

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

У рабоце «Ліст да каханага» мастачка увасобіла сцэну з паўсядзённага жыцця і фантастычны свет казак і паданняў, якая спалучае дэкаратыўнасць з апавядальнасцю, індывідуальнасць бачання з традыцыйнай народнай трактоўкай, элементы сельскай і гарадской культур. Пейзаж яна малюе традыцыйна для падобных твораў: возера ці рэчка з лілеямі, лебедзямі, лодкай, дрэвы і кусты на беразе, поўны месяц на блакітным небе. Тут жа — выявы птушак і жывёл, якія ў звычайным разуменні быццам бы не адпавядаюць такому пейзажу і якіх аўтар "жыўцом" яўна не бачыла: на бярозавых галінах сядзіць натапыраная птушка, падобная на нейкага дагістарычнага драпежніка, на квітнеючы луг выходзяць ільвы, што нагадваюць дабрадушных катоў. [2 с. 232]

Творчасць Алены Кіш — унікальная з'ява, з-пад яе пэндзля выходзілі надзвычай шматфарбныя, непасрэдныя, напаўрэальныя, напаўфантастычныя творы, якія надавалі інтэр'еру жылля дэкаратыўнасць і казачнасць. Стэрэатып "лепшага свету" у большай ці меншай ступені характэрны для мастацтва роспісу дываноў у цэлым, аднак у творчасці Алены Кіш гэта выявілася найбольш ярка.

Маляваныя дываны сельскай майстрыхі Алены Кіш — класіка беларускага інсітнага мастацтва, феномен творчасці аўтсайдараў. Імя Алены Кіш аздзінае з імён беларускіх мастакоў увайшло ў Сусветную энцыклапедыю наіўнага мастацтва.

Літаратура

1. Беларускія маляваныя дываны. Альбом-каталог з фондаў гісторыка-культурнага музея-запаведніка "Заслаўе" / Склад. І. Арцем'ева, Ю. Малаш, А Рак. – Мінск: Рыфтур, 2005. – 64 с.
2. Сахута, Я.М. Народнае мастацтва Беларусі/ Я.М. Сахута. – Мінск: БелЭн, 1997. –287 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ